Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 МАЯ 2008 г. СУБОТА № 100 (26213)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага! «Прамая лінія»

## Заяўляючы аб сабе на поўны голас, пашкадуй галасавыя звязкі

Для кожнага чалавека голас — інструмент зносінаў з навакольнымі. А для некаторых ён яшчэ і рабочы інструмент. Не толькі спевакі, акцёры, дыктары, але і прадаўцы, настаўнікі, палітыкі эксплуатуюць свае галасавыя звязкі практычна ўвесь працоўны дзень. Як захаваць галасавыя здольнасці чалавеку, чый голас слабы ад прыроды? Чаму мы хрыпім і сіпім, бывае, нечакана німеем? Чаму адны людзі храпуць у сне, а іншыя — не? І ці можа медыцына дапамагчы храпуну? Аб чалавечым голасе і захворваннях галасавога апарату ў дарослых і дзяцей мы пагаворым на чарговай «прамой лініі». Да нас у рэдакцыю прыйдзе **ўрач-фаніятр Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і маўлення Вольга Іванаўна РАДЗІВОНАВА.**

***«Прамая лінія» адбудзецца 5 чэрвеня, у чацвер, з 15.30 да 17.00 па тэлефонах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць на нумарах: 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).***

## Беларусь ускладае вялікія надзеі на таленавітую моладзь

**Беларусь на сучасным этапе развіцця робіць стаўку на веды, талент і інтэлект, заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 30 мая на сустрэчы з адоранымі навучэнцамі і студэнтамі, лаўрэатамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта.**

На мерапрыемстве, якое стала ўжо традыцыйным, былі запрошаны 72 пераможцы міжнародных прадметных алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, лаўрэаты спецыяльных фондаў Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў, студэнтаў і таленавітай моладзі, а таксама 9 педагогаў.

«Стаўка на веды, талент і інтэлект — аснова сучаснай стратэгіі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Пошук і выхаванне маладых талентаў — найважнейшая дзяржаўная задача», — адзначыў Прэзідэнт, дадаўшы, што энергічныя, працавітыя, адораныя людзі — галоўнае багацце нашай краіны. За 12 гадоў работы спецыяльных фондаў Прэзідэнта прэміямі і стыпендыямі адзначана больш як 18 тыс. школьнікаў, студэнтаў, дзеячаў мастацтва і педагогаў, рэалізавана нямала творчых і навуковых праектаў. У Беларусі робіцца многае для выяўлення і развіцця талентаў юных грамадзян: створаны ліцэі і гімназіі, адкрыты шматлікія школы мастацтваў, гурткі, студыі, секцыі, працуюць самадзейныя калектывы. Паспяхова рэалізуецца дзяржаўная праграма «Маладыя таленты Беларусі».

Паводле слоў Прэзідэнта, па-сапраўднаму масавымі і папулярнымі сталі прадметныя алімпіяды і турніры, фестывалі і конкурсы дзіцячай і маладзёжнай творчасці. Так, у гэтым навучальным годзе ў рэспубліканскай алімпіядзе прынялі ўдзел больш як 600 тыс. школьнікаў.

Значныя поспехі юных беларусаў і на ўсемагчымых міжнародных конкурсах і алімпіядах. У мінулым годзе усе 28 беларускіх удзельнікаў сталі прызёрамі міжнародных прадметных алімпіяд, прэстыжных турніраў.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў юным талентам пасведчанні і нагрудныя знакі лаўрэатаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта. «Няхай гэтыя поспехі і заслужаныя ўзнагароды натхняць на заваяванне новых вяршынь у вучэнні, навуцы і мастацтве, дапамогуць пераадолець цяжкасці, будуць стымулам для прафесійнага і творчага росту», — пажадаў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы падзякаваў таксама педагогам за энтузіязм і адданасць прызванню і звярнуў увагу маладых талентаў на тое, што ў іх высокіх выніках — немалая заслуга настаўнікаў і бацькоў.

«Не забывайцеся, што вы таленавітыя людзі. Знайдзіце сябе ў гэтым няпростым жыцці, а мы па меры нашых магчымасцяў будзем дапамагаць вам у гэтым», — сказаў на заканчэнне Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**




*Патомны палачанін Юрый Кімстач працуе на рэстаўрацыі праваслаўнага Богаяўленскага сабора. Да свята горада храм набывае новае аблічча.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Беларусь адкрыта для перагавораў з любымі інвестарамі

**заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на пасяджэнні Кансультатыўнага савета па замежных інвестыцыях у Мінску.**

Паводле яго слоў, галоўная задача ўрада Беларусі — далейшае паляпшэнне інвестыцыйнага клімату і ўваходжанне рэспублікі ў лік краін з найбольш прывабнымі ўмовамі для інвеставання — цяпер Беларусь займае 110-ю пазіцыю ў гэтым спісе. «Мы робім усё магчымае, каб інвестары ў Беларусі адчувалі сябе камфортна, інвестыцыйны клімат паляпшаўся», — дадаў Сяргей Сідорскі.

Далейшае нарошчванне інвестыцыйнага патэнцыялу звязана са стварэннем спрыяльных умоў вядзення бізнесу. Ён нагадаў, што Беларусь — адзіная краіна ў СНД, у якой прыняты Інвестыцыйны кодэкс. За апошні час істотна спрошчаны працэдуры рэгістрацыі прадпрыемстваў (тэрмін разгляду дакументаў пры рэгістрацыі скарочаны з 20 да 5 дзён, пачаў актыўна дзейнічаць прынцып «аднаго акна»), зменшаны пералік дакументаў, неабходных для атрымання суб'ектамі гаспадарання ліцэнзій, устаноўлены тэрміны для чыноўнікаў пры ажыццяўленні асобных працэдур і прыняты іншыя меры. Сярод станоўчых рашэнняў па паляпшэнні інвестыцыйнага клімату Сяргей Сідорскі таксама адзначыў зняцце абмежаванняў на абарачэнне «мараторных» акцый. «Мы пабудуем другую чаргу МАЗа і МТЗ і давядзём выпуск да 100 тыс. машын у год», — сказаў прэм'ер.

**БЕЛТА.**

Парламенцкі дзённік

# «МАЮ ПЫТАННЕ ДА ЎРАДА...»

**У Авальнай зале ўчора адбылося сумеснае пасяджэнне парламентарыяў абедзвюх палат, дзе яны маглі задаць пытанні кіраўнікам і членам Урада Беларусі. Пра асноўныя сацыяльна-эканамічныя паказчыкі развіцця краіны паведаміў падчас свайго выступлення віцэ-прэм'ер Віктар БУРА.**

У прыватнасці, паводле яго інфармацыі, сёлета за студзень — красавік было ўведзена ў эксплуатацыю прыблізна 1,4 млн квадратных метраў жылля. Дах над галавой атрымлівае ўсё больш жыхароў сельскай мясцовасці і малых гарадоў. Там за гэты час уведзена ажно 620 тыс. квадратных метраў жылля. Агульная «планка» па ўсёй краіне сёлета — больш як 5 млн квадратных метраў. Куды больш жылля было адрамантавана, увогуле сёлета плануецца правесці капрамонт больш як на 1 млн кв. метраў жылля. Большасць беларусаў карыстаецца лічыльнікамі вады — яны ўстаноўленыя прыблізна ў двух мільёнах кватэр.

Налета пры інвеставанні ў будаўніцтва прыярытэт будзе аддавацца пачатым будоўлям. Шанц на ўключэнне ў Дзяржаўную інвестыцыйную праграму на 2009 год атрымаюць толькі тыя аб'екты, праекты якіх будуць зацверджаныя да 1 жніўня. Віцэ-прэм'ер падкрэсліў сацыяльную накіраванасць дзяржаўнай інвестыцыйнай палітыкі — аб'екты культурнага, спартыўнага, адукацыйнага прызначэння, сацыяльнае жыллё.

Оптавалаконныя сеткі пракладваюць у сельскай мясцовасці, каб забяспечыць вяскоўцам магчымасць доступу ў Інтэрнэт. Актыўна выкарыстоўваецца тэхналогія Wi-Fi, якая забяспечвае бесправадны доступ у Інтэрнэт — у сталіцы і абласных цэнтрах функцыянуе 109 пунктаў доступу. Яны размяшчаюцца ў кавярнях, гасцініцах, універсітэтах і іншых грамадскіх месцах. Колькасць карыстальнікаў паслугамі сотавай сувязі, паводле слоў віцэ-прэм'ера, сёння перавышае 7,3 млн чалавек, а зона пакрыцця складае каля 90 працэнтаў тэрыторыі краіны.

### ЦЯЖАРНЫМ ЖАНЧЫНАМ — БЯСПЛАТНЫ ПРАЕЗД?

Клопат аб цяжарных жанчынах прадэманстраваў на сумесным пасяджэнні **дэпутат Віктар ГУМІНСКІ:**

— Часта назіраю ў грамадскім транспарце такую карціну: жанчыны на апошніх месяцах цяжарнасці скрозь натоўп цягнуцца пракампасціраваць талончык. А побач едуць «зайцы», якія і не думаюць нікуды цягнуцца. Вось я і думаю: у той сітуацыі, калі мы працуем над паляпшэннем дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, ці можам мы адмяніць аплату праезду ў грамадскім транспарце для цяжарных жанчын, калі яны ўжо ў дэкрэтным водпуску? Бо яны свой грамадзянскі абавязак перад дзяржавай і так з лішкам выконваюць.

У адказ на прапанову дэпутата **міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір ПАТУПЧЫК** прапанаваў павышаць дапамогі жанчынам па цяжарнасці і родах.

— І гэта пытанне ўжо прапрацоўваецца, — адзначыў міністр. — Памер дапамогі павінен дазваляць жанчыне купляць столькі праязных білетаў, колькі неабходна.

### ЦЭНЫ НА ЯЛАВІЧЫНУ І МАЛАКО

Адказваючы на пытанні дэпутатаў, **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сямён ШАПІРА**, запэўніў, што рэзкага павелічэння цэнаў на прадукцыю жывёлагадоўлі не будзе. Закупачныя цэны, скажам, на мяса птушкі і свініну ў Беларусі адпавядаюць аналагічным у суседніх краінах. А вось цана ялавічыны, як высветлілася, істотна ніжэйшая:

— Сёння ялавічына ў жывой вазе каштуе ў сярэднім 3 тыс. рублёў, а ў суседніх краінах — ад 8 да 12 тыс. рублёў. І складваецца сітуацыя, калі гэта мяса транзітам ідзе міма буйных гарадоў, у тым ліку і Мінска, — патлумачыў міністр. — Запасы ялавічыны на складах тут невялікія, хоць у краіне дастаткова ялавічыны для таго, каб забяспечыць насельніцтва Беларусі ды яшчэ і прадаваць за мяжу. У сувязі з гэтым мы просім падняць закупачныя цэны на ялавічыну на 10 працэнтаў. Неабходнасць павышэння выклікана таксама і тым, што даражэйшымі сталі ўгнаенні.

Крыху ніжэйшыя ў нашай краіне ў параўнанні з суседнімі і цэны на малако.

— Мы хочам падняць цэны на малако пасля заканчэння так званага перыяду «вялікага малака» — увосень, — дадаў Сямён Шапіра.

### ШКОЛЬНАЕ ПЫТАННЕ ЎСЁ ЯШЧЭ БЕЗ АДКАЗУ

Без адказу засталося каверзнае пытанне **Галіны МАЗУРКЕВІЧ, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.** Спадарыня Мазуркевіч не стала хадзіць вакол ды каля і напрамую запытала першага намесніка **міністра адукацыі Аляксандра ЖУКА:** «У практыцы міжнароднай супольнасці ў выпадку правалу таго ці іншага дзяржаўнага праекта галаўное ведамства поўным складам ідзе ў адстаўку. Ці збіраюцца міністр адукацыі і яго намеснікі здзейсніць гэта? Атрымліваецца, тыя ж людзі, адмовіўшыся ад таго, што прапагандавалі доўгі час і вельмі настойліва, працягваюць працу ад процілеглага». Галіна Аляксееўна цікавілася таксама, чаму адмяняецца профільнае навучанне ў школах, як патлумачыць мяркуемую адмену прадмета «Чалавек. Грамадства. Дзяржава»? Першы намеснік міністра заявіў, што створана міжведамасная камісія, у працы якой бяруць удзел чыноўнікі, навукоўцы, кіраўнікі навучальных устаноў і чакаецца, што ў хуткім часе праца яе будзе завершана, аднак «пакуль рашэнне не прынята (а прымацца яно будзе на самым высокім узроўні), абмяркоўваць гэтыя пытанні заўчасна».

Дэпутаты цікавіліся таксама пра размеркаванне выпускнікоў ВНУ: чаму выдатнікі выконваюць дзяржзаказ і размяркоўваюцца на дзяржаўныя прадпрыемствы, а менш паспяховыя студэнты атрымліваюць магчымасць размеркавацца па сваёй заяўцы і нярэдка на прыватныя прадпрыемствы? Тым самым яны, па сутнасці, аказваюцца ў больш прывілеяваным становішчы.

— Гэта першае размеркаванне ў адпаведнасці з новай пастановай. Вынікі сёлетняга размеркавання абавязкова будуць прааналізаваныя. Безумоўна, арганізацыі з рознай формай уласнасці могуць прэтэндаваць на маладых спецыялістаў, — пракаментаваў Аляксандр Жук. — Я думаю, што да гэтага пытання мы яшчэ вернемся. Вось, напрыклад, Парк высокіх тэхналогій, які сёння на перадавых рубяжах развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і мае вялікую патрэбу ў спецыялістах гэтай сферы.

### АБУРАНЫЯ ЕЎРАБАЧАННЕМ

**Дэпутат Генадзь ДАВЫДЗЬКА** пацікавіўся, якія сумы з бюджэту выдаткаваныя на падрыхтоўку да Еўрабачання і чаму з беларускімі выканаўцамі займаюцца пераважна замежныя спецыялісты, «у той час як мы прызнаём, што ў нас найлепшы балет, добрая эстрада, вялікі вопыт правядзення «Славянскага базару»?

**Намеснік міністра культуры Уладзімір ГРЫДЗЮШКА** запэўніў, што на падрыхтоўку да ўдзелу ў сёлетнім конкурсе з бюджэту Міністэрства культуры не было патрачана ні капейкі. «Фінансавала Беларускае тэлебачанне», — дадаў ён. «Мы накіроўваем туды чалавека ў рамках тэлевізійнага праекта. Пакуль, на жаль, не атрымліваецца, каб наш чалавек прыехаў з дастойным вынікам адтуль». Леташні вынік Дзмітрыя Калдуна, відаць, не задаволіў Міністэрства культуры...

**Сяргей КАСЦЯН, намеснік старшыні пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД,** надзвычай эмацыянальна выказаў сваё абурэнне тым, што беларускія выканаўцы спяваюць па-англійску. Уладзімір Грыдзюшка заўважыў, што песня на англійскай мове можа быць лепш успрынятая еўрапейскай аўдыторыяй, праўда, дадаў, што нашы выканаўцы не заўсёды спяваюць на добрай англійскай мове.

### «ІДЗІЦЕ Ў ЛАЗНЮ»?

Пазбаўляць насельніцтва гарачай вады не на некалькі тыдняў, адключаючы яе ў раёнах, а максімум на дзень, адключаючы пад'езд ці дом, прапанаваў **Уладзімір ЗДАНОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе.** Ён таксама пацікавіўся ў **міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзіміра БЕЛАХВОСТАВА,** ці ёсць такая практыка ў іншых еўрапейскіх гарадах.

Міністр адказаў, што гарачую ваду адключаюць у многіх буйных гарадах. У нас па тэхнічнай дакументацыі прадугледжана адключэнне гарачай вады на 24 дні — у гэты час праводзяцца тэмпературныя выпрабаванні цеплавых сетак, неабходныя для іх безаварыйнай працы. Згодна з даручэннем кіраўніка краіны, гэты тэрмін быў скарочаны да 12—14 дзён. І можа быць падоўжаны ў індывідуальных выпадках. Як выйсце, міністр прапанаваў наведваць дзяржаўныя лазні.

**Ала МАЧАЛАВА.**

ISSN 1990 - 763X

08100>

9 771990 763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.05.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 134,00 |
| 1 еўра | 3 301,62 |
| 1 латвійскі лат | 4 711,34 |
| 1 літоўскі літ | 956,65 |
| 1 чэшская крона | 131,65 |
| 1 польскі злоты | 976,95 |
| 1 расійскі рубель | 89,90 |
| 1 украінская грыўня | 445,28 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 23,7384 |
| 10 UAH | 49,3501 |
| 1000 BYR | 11,1144 |
| EUR | 36,7827 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 30.05.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

Ведай нашых!

# НА ШТО ЗДАТНЫ «ЦЮНІНГАВЫ» «БЕЛАРУС»?

**Днямі ў Растоўскай вобласці прайшлі спаборніцтвы на званне лепшага трактарыста Расіі. Прычым, да ўмоў правядзення гэтага конкурсу арганізатары і ўдзельнікі падышлі адмыслова, з «агеньчыкам»: замест, падавалася б, звыклага для тэхнікі ворыва, трактары «выпусцілі» на трасу тыпу «джып-трыал». Самае цікавае, што асноўным «жалезным конікам» такіх незвычайных спаборніцтваў сталі нашы айчынныя «Беларусы».**

Яны так ліха ляталі па трасе, што для гледачоў загадзя адвялі месцы далей ад яе. А што вы хочаце: пры максімальнай хуткасці 40 кіламетраў у гадзіну «спартсмены» выдавалі ўсе 70 кіламетраў у гадзіну! У тэлесюжэце цікава было назіраць, як «Беларусы», нібы тыя «ластаўкі», узнімаюцца ў паветра, праходзячы складаную трасу. Безумоўна, і арганізатары спаборніцтваў, і ўдзельнікі не хавалі, што такую хуткасць дэманструюць не базавыя мадэлі, а ўдасканаленыя рукамі майстроў.

«Трактарны цюнінг», як гаварылася, папярэдне праводзіўся на працягу некалькіх месяцаў — у кожнага ўдзельніка на свой густ. Канкрэтныя сакрэты, вядома, ніхто агучваць не імкнуўся. У якасці агульнай інфармацыі гаварылася толькі пра тое, што было навідавоку і што схаваць нават пры жаданні было немагчыма. Так, для лепшай устойлівасці на трасе (пры такой хуткасці) на трактары навешвалі дадатковы груз над пярэднімі коламі, больш цяжкімі рабілі і заднія. Згадвалася замена газагенератараў, больш магутныя паліўныя помпы. А як ставяцца ў нас да такіх спаборніцтваў? Па невялікі каментарый мы звярнуліся на Мінскі трактары завод да **в.а. галоўнага канструктара прадпрыемства Васіля ЖУКА.**

Паводле яго слоў, афіцыйна завод не рыхтаваў машыны да такіх спаборніцтваў, не аказваў ніякай тэхнічнай падтрымкі арганізатарам, хоць апошнімі быў праінфармаваны пра маючы адбыцца конкурс. А чаму б і не, хто адмовіцца ад рэкламы?

— Гэта рэгіянальная задумка наконт спаборніцтваў, такія своеасаблівыя шоў характэрныя для некаторых рэгіёнаў Расіі, у тым ліку і Растоўскай вобласці. Чаму былі абраныя менавіта беларускія трактары для ўдзелу ў іх? МТЗ — самы масавы, самы папулярны трактар не толькі на поўдні, але і ўвогуле ва ўсёй Расіі. Дарэчы, наколькі вядома, пераможца ў якасці прыза павінен атрымаць таксама новы трактар МТЗ ад нашага рэгіянальнага прадстаўніка, — сказаў Васіль Уладзіміравіч.



Паводле слоў спецыяліста, удзельнікі шоў «дабівалі» ўласныя машыны, паколькі перароблены такім чынам трактар, калі ў трансмісію ўносяцца змяненні, змяняецца перадатачнае чысло, фарсіруецца рухавік, працаваць у якасці звычайнай сельскагаспадарчай тэхнікі ўжо не можа. «Гэта не рабочая машына, цяпер яна можа выступаць толькі вось на такіх спаборніцтвах. Але органы тэхнічнага нагляду, Дзяржаўтаінспекцыя, відавочна, дазволілі зрабіць такую «мадэрнізацыю».

Падчас выпрабаванняў трактароў на спецыяльным палігоне, як сказаў далей суразмоўца, яны таксама развіваюць высокую хуткасць («не 70 кіламетраў у гадзіну, вядома ж»), высока «скачуць» на спецыяльнай трасе з перашкодамі. Разліковы тэрмін эксплуатацыі машыны без капрамонту складае больш за 10 гадоў, таму выпрабаванні і праводзяцца ў такім паскораным рэжыме. Як кажуць, на карысць справе, а не дзеля шоў. Дарэчы, яшчэ пра апошнія. На Захадзе спецыяльна абсталяваныя трактары цягнуць за сабой баласт — хто далей (такі ж этап быў і ў спаборніцтвах у Растоўскай вобласці, калі машыны цягнулі за сабой груз вагой у адну тону). У краінах СНД такія забавы яшчэ не вельмі папулярныя. Спаборніцтвы мы папрасілі пракаментаваць (завочна, зразумела) і нашага чытача — **трактарыста сельскагаспадарчага філіяла «Крыніца» ААТ «Мінскрамбуд» Капыльскага раёна Уладзіміра ЛОГМАНА,** які ў гэты момант на «Амкадоры-332» трамбаваў сіласную яму.

— А што, нармальная з'ява. Сам працаваў на «Беларусах», максімальная хуткасць у іх 36—37 кіламетраў у гадзіну. Колькі я асабіста максімальна «выціскаў»? Ну, было неяк на МТЗ-82... (Рэдакцыя пакідае названую лічбу ў тайне.) Так, мог бы і паўдзельнічаць у такіх спаборніцтвах, не гаворачы, што і проста паназіраў бы з задавальненнем.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВА ЎКРАІНЕ СТАРТАВАЛА АГІТКАМПАНІЯ Ў ПАДТРЫМКУ ЎСТУПЛЕННЯ КРАІНЫ Ў НАТА

**Акцыя пад лозунгам «НАТА — ТАК», ініцыяваная прапрэзідэнцкай партыяй «Наша Ўкраіна», пачалася 30 мая ў палацы «Ўкраіна» ў Кіеве з выканання гімна Еўрасаюза.**

Перад урачыстым сходам дэлегаты з Крыма распавядалі ў кулуарах, што плануюць усталяваць у Севастопалі гадзіннік, які будзе адлічваць час да вываду Чарнаморскага флота РФ у маі 2017 года. Плануецца, што неўзабаве па раніцах жыхароў Севастопаля будзе абуджаць песня «Бывай, любімы горад, сыходзім заўтра ў мора...»

Напярэдадні, 29 мая, урад Украіны прыняў дзяржаўную мэтавую праграму інфармавання грамадскасці па пытаннях еўраатлантычнай інтэграцыі на перыяд да 2011 года. Да гэтага часу кіраўніцтва краіны мае намер давесці ўзровень падтрымкі насельніцтвам уступлення краіны ў НАТА да 55 працэнтаў з цяперашніх прыкладна 20. На рэалізацыю праграмы за 4 гады плануецца выдаткаваць больш за 6 млн долараў.

### ЕЎРАПЕЙЦЫ АДДАЮЦЬ ПЕРАВАГУ АБАМЕ

**Паводле вынікаў апытання, праведзенага ў пяці краінах, жыхары Еўропы хацелі б бачыць Барака Абаму ў якасці прэзідэнта ЗША, піша The Telegraph. Толькі 15 працэнтаў жыхароў Францыі, Італіі, Германіі, Вялікабрытаніі і Расіі аддаюць перавагу на гэтай пасадзе Джону Макейну.**

Акрамя таго, апытанне прадэманстравала антыамерыканскія настроі ў свеце: 56 працэнтаў апытаных у Расіі лічаць, што ЗША прыносяць у свет зло, і толькі трэць брытанцаў лічыць уплыў ЗША на астатні свет спрыяльным. Лепш за іншых да Амерыкі ставяцца італьянцы.

Барак Абама таксама асабліва папулярны ў Італіі. 70 працэнтаў апытаных прагаласавалі б за яго, калі б маглі. У Францыі яго падтрымліваюць 65 працэнтаў апытаных, а ў Германіі — 67 працэнтаў. Пры гэтым толькі 6 працэнтаў немцаў гатовыя падтрымаць Макейна.

### ГОРДАН БРАУН АСАБІСТА ТЭЛЕФАНУЕ НЕЗАДАВОЛЕНЫМ БРЫТАНЦАМ

**Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Гордан Браун асабіста тэлефануе незадаволеным брытанцам, якія даслалі яму лісты або скаргі, піша The Guardian.**



Крыніцы, блізкія да брытанскага ўрада, сцвярджаюць, што за тыдзень Браун патэлефанаваў не менш чым 25 чалавекам. Лісты, на якія прэм'ер адказваў у асабістай тэлефоннай гутарцы, выбіраліся адвольна. Адказы на зробленыя ў лістах заявы загадзя рыхтаваліся спецыялістамі.

Гордан Браун вядомы тым, што прачынаецца і пачынае працоўны дзень вельмі рана. Ёсць інфармацыя аб тым, што адзін са званкоў ён, не падумаўшы, зрабіў у шэсць гадзін раніцы. На шчасце, суразмоўца ў гэты дзень таксама прачнуўся рана, і званок прэм'ера яго не абудзіў. Зрэшты, ва ўрадзе не пацвердзілі пэўнасць гэтай гісторыі. Паміж тым рэйтынг узначаленай Горданам Браунам партыі лейбарыстаў ізноў упаў на рэкордна нізкі ўзровень. Партыю падтрымліваюць усяго 23 працэнты брытанцаў.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### МОЦНЫХ ДАЖДЖОЎ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ ЧЭРВЕНЯ НЕ ПРАДБАЧЫЦЦА

**Гэтымі днямі краіны Заходняй Еўропы захлынула хваля моцных дажджоў, а ў паўднёвай частцы Вялікабрытаніі працяглыя ападкі выклікалі сур'ёзную паводку. Паводле інфармацыі начальніка службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрыя Рабава, у бліжэйшыя пяць дзён тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца ў зоне скандынаўскага антыцыклону, таму дажджоў не прадбачыцца ўвогуле.**

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі айчынных сіноптыкаў, сур'ёзных дажджоў не будзе ў нашай краіне ў першай палове першага месяца лета. Разам з тым спецыяліст упэўнены, што ў ліпені, а магчыма, і ў жніўні, хваля моцных дажджоў абавязкова зачэпіць і тэрыторыю Беларусі. Такія ліўневыя сюрпрызы адбываюцца летам у нас амаль кожны год. Гэта не палохае, галоўнае, каб у зоне буйных гарадоў за адзін дзень не выпала больш за месячную норму ападкаў. Пры такіх ліўнях у нас можа ўзнікнуць і паводка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### АСЦЯРОЖНА: СТАРЫЯ ГРОШЫ!

**У Гомельскай вобласці зарэгістравана некалькі фактаў махлярства, звязаных з выкарыстаннем у якасці разліку за тавар купюры вартасцю Br500 тыс., выведзенай з абарачэння падчас дэнамінацыі.**

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўпраўленні па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Гомельскага аблвыканкама, на працягу апошніх чатырох дзён падобныя выпадкі зарэгістраваны ў Рагачоўскім раёне і Гомелі. Так, у сельскім магазіне вёскі Сенажаткі невядомы мужчына на выгляд 45—48 гадоў разлічыўся 500-тысячнай купюрай, зрабіўшы пакупку прадуктаў харчавання і спажывецкіх тавараў на Br230 тыс. Аналагічны выпадак адбыўся ў адным з прыватных магазінаў абласнога цэнтра, дзе такім жа чынам зламыснік, які супадаў па апісанні з папярэднім, атаварыўся на Br257 тыс.

**Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.**

### ЗОНЫ, ДЗЕ НЕЛЬГА ПІЦЬ

**Ва ўсіх буйных гарадах Віцебскай вобласці з'явяцца зоны цвярозасці. З 1 ліпеня, згодна з рашэннем Віцебскага аблвыканкама, такія зоны з'явяцца ў Оршы, Полацку, Наваполацку і самім абласным цэнтры.**

Кіраўніцтва УУС аблвыканкама, якое з'яўляецца аўтарам гэтай ініцыятывы, вызначае месцы ў населеных пунктах, дзе нельга будзе ўжываць піва і моцныя алкагольныя напоі. У прыватнасці, у Віцебску плануецца аб'явіць табу на спіртное ў парку Фрунзе, на плошчы Перамогі...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ПАТРУЛЬ «УЗМЫЕ» Ў НЕБА

**З панядзелка, калі пацвердзіцца прагноз сіноптыкаў наконт пацяплення, у паветра для патрулявання лясных угоддзяў будуць узняты ўсе 15 «бартоў» (акрамя шасці адзінак рэзерву) рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беллесавія» Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

Паводле слоў яго дырэктара Аляксея Пшонкі, пакуль жа сітуацыя даволі спакойная: у дзень рэгіструецца два-тры пажары, у паветры працуе часам толькі адзін «борт». На палеткі, куды з-за пераўвільгатнення глебы не змагла зайсці сельскагаспадарчая тэхніка, пяць верталётаў і два самалёты ўносілі ўгнаенні, вялі падкормку культур. У агульнай суме пілоты налеталі там 760 гадзін, што даволі шмат.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### БЕЛАРУСКІ РЫНАК — ШМАТАБЯЦАЛЬНЫ

**Беларускі народны банк да канца гэтага года мае намер павялічыць сваю долю на айчынным рознічным рынку да 10 працэнтаў замест сённяшніх 0,1 працэнта, паведаміла на прэс-канферэнцыі ў Мінску старшыня праўлення банка Любоў Каляжнюк.**

Падставай для такой аптымістычнай заявы стаў прыход стратэгічнага інвестара: у маі Банк Грузіі, які кантралюе 35 працэнтаў грузінскага банкаўскага рынку, набыў 70 працэнтаў акцый ААТ «Беларускі народны банк» за 34,2 мільёна долараў. Паводле слоў старшыні назіральнага савета Банка Грузіі Нікалаза Энукідзе, зыходзячы з таго, што ў абарачэнні знаходзяцца 30 мільёнаў акцый, у капіталізацыі банка дабавілася каля 100 мільёнаў долараў. Гэта, дарэчы, сведчыць пра тое, што замежныя інвестары станоўча глядзяць на беларускі рынак. Паводле ацэнак банкіра, беларускі рынак — шматабяцальны, акрамя таго ён хутка развіваецца, а наша дынамічная эканоміка дае цікавыя магчымасці як для карпаратыўных, так і для рознічных паслуг.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

### ПЕСНІ Ў ПАДАРУНАК

**Іх прывезлі выхаванцам сталічнай школы-інтэрната № 3 удзельнікі тэлевізійнага музычна-забаўляльнага праекта «Наша пяцёрачка». Перш чым адправіць праграму на навагоднія канікулы, яе стваральнікі наладзілі дабрачынны канцэрт для дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў. Узначальвалі дабрачынны дэсант зоркі дзіцячага «Еўрабачання», вядучыя праекта Ксенія Сітнік і Андрэй Кунец.**

Не змог скласці ім кампанію толькі трэці сувядучы, Лёша Жыгалковіч, які знаходзіўся на той час у Бялградзе, падтрымліваючы Руслана Аляхно. Затое выступілі лепшыя ўдзельнікі і пераможцы хіт-параду дзіцячых кліпаў — Кірыл Ермакоў, Даша Надзіна, Аня Зайцава, Рома Валазнёў, Насця Асмалоўская...

Невытлумачальна, але ў дзень правядзення канцэрта ва ўсім будынку школы-інтэрната знікла электрычнасць, і мерапрыемства аказалася пад пагрозай зрыву. Але арганізатары вырашылі, што гэта не падстава для пераносу і тым больш адмены акцыі, якой дзеці так чакалі, і з Белтэлерадыёкампаніі спецыяльна прывезлі перасоўную электрастанцыю. Таму канцэрт, хоць і са спазненнем, усё ж адбыўся.Канцэрт «Дзеці — дзецям» быў прысвечаны адразу дзвюм датам, аднолькава важным для дзяцей — пачатку летніх канікулаў і Дню абароны дзяцей. Якраз 1 чэрвеня, дарэчы, у эфіры «Нашай пяцёрачкі» на канале «ЛАД» з'явіцца рэпартаж з гэтай акцыі. А сама праграма ўжо ў ліпені таксама пойдзе на канікулы да восені.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ 17.06.2008 г. ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

на право заключения договора аренды земельного участка пл. 0,5740 га сроком на 50 лет для строительства торгового центра в д. Новые Грядки Жодинского сельского исполнительного комитета Смолевичского района. Начальная цена предмета аукциона – 3 794 902 белорусских рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.04.2008 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 16.06.2008 г. до 17.00.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости». УНП 690324015

Замор'е

## ЕЎРАПЕЙСКІЯ МУЖЧЫНЫ БУДУЦЬ МЕСЯЦ НЕДАСТУПНЫЯ



*Магчыма, толькі такі від зможа прыцягнуць увагу мужчыны-балельшчыка.*

**Амаль тры чвэрці жыхароў Іспаніі аддадуць перавагу прагляду матчаў чэмпіянату Еўропы па футболе 2008 года, а не сэксу. Такімі нечаканымі аказаліся вынікі апытання еўрапейскіх прыхільнікаў футбола, праведзенага Брытанскім цэнтрам сацыяльных даследаванняў.**

У залежнасці ад краіны футбольныя і сэксуальныя перавагі апытаных значна адрозніваюцца. Дзеля прагляду футбольных матчаў гатовыя ахвяраваць сэксам 72 працэнты іспанскіх фанатаў, 67 — нарвежскіх, 64 — галандскіх, 62 — нямецкіх і 61 — брытанскіх. І толькі 17 працэнтаў апытаных партугальцаў заявілі, што яны «аддалі б перавагу футболу замест занятку сэксам». Сярод італьянцаў такі паказчык роўны 25 працэнтам, сярод французаў — 27, бельгійцаў — 30.

Каб забяспечыць добры прыём, супрацоўнікі швейцарскай пагранічнай службы праходзяць спецыяльны курс добрых манер, вывучаючы асновы зносінаў з футбольнымі аматарамі з розных краін. Цікава, што сваім уласным балельшчыкам арганізатары забаранілі з'яўляцца на стадыёнах і ў месцах трансляцый матчаў з адным з нацыянальных знакаў і абавязковым атрыбутам фанатаў — з вялікімі каровінымі званочкамі. Гэтыя бяскрыўдныя званкі традыцыйна суправаджаюць усе перамогі і паражэнні швейцарскіх спартсменаў, аднак арганізатары ацанілі бяспеку вышэй за традыцыі. А ў швейцарскім горадзе Базель, дзе адбудзецца некалькі матчаў, адкрылася спецыяльная турма для балельшчыкаў. У яе патрапяць фанаты, якія будуць парушаць швейцарскія законы падчас Еўра-2008. Турма разлічаная на 350 зняволеных, для якіх будуць створаны максімальна камфортныя ўмовы, яе будынак быў пабудаваны ў XIX стагоддзі.

## ТЭХНІКА ДАЙШЛА



**Нядаўна адбылося адкрыццё вельмі незвычайнага прыстасавання, а дакладней — тэхналагічнай інсталяцыі ў стылі стымпанк, якая з'яўляецца падземным тэлескопам паміж Лонданам і Нью-Йоркам.**



Тэлектраскоп работы Пола Сэнт-Джорджа зусім не розыгрыш, а сапраўды дазваляе памахаць адзін аднаму рукой жыхарам Лондана і Нью-Йорка. Сэнт-Джордж сцвярджае, што пабудаваў інсталяцыю па чарцяжах дзядулі, марай якога было стварэнне трансатлантычнага тэлескопа. Нью-Йоркская частка тэлескопа знаходзіцца каля Бруклінскага моста, а лонданская — каля Таўэрскага. Як вы, мусіць, ужо здагадаліся, тэхнічна Тэлектраскоп (Telectroscope) — гэта набор вэбкамер і манітораў.

А студэнт універсітэта Art Center Pasadena Джэйк Ланьяк прапанаваў вельмі незвычайны канцэпт матацыкла Deus Ex Machina (Бог з машыны). Транспартны сродак — гэта экзашкілет (робат, які надзяваецца на чалавека) з трыма коламі. Стойкі з пярэднімі коламі з'яўляюцца рухомымі для павелічэння ўстойлівасці пры павелічэнні хуткасці.

## ВОСЬ ТАКАЯ ДАМАВАЯ

**Бяздомная японка на працягу года жыла ў шафе ў кватэры 57-гадовага жыхара горада Фукуока. Выявіць «суседку» атрымалася толькі з дапамогай скрытай камеры, якую ён усталяваў пасля знікнення прадуктаў з халадзільніка.**

«Жыхарку» шафы выявіла паліцыя, якую выклікаў японец пасля прагляду запісу камеры назірання. Высветлілася, што за месяцы пражывання ў шафе бяздомная 58-гадовая японка па імені Татсуке Харыкава ўмудрылася абуладкаваць сабе спальнае месца (у шафе яна схавала матрац) і нават стварыць невялікі запас ежы. Прадукты яна брала з халадзільніка гаспадара.

Пасля арышту Харыкава растлумачыла, што ёй не было дзе жыць. Паліцэйскія лічаць, што японка пражыла ў шафе каля года, прычым, хутчэй за ўсё, яна перыядычна незаконна пражывала і ў суседніх дамах.

## АМЕРЫКАНЦЫ ПЕРАСТАЛІ ПАЎНЕЦЬ?

**Працэнт амерыканскіх дзяцей, якія пакутуюць ад лішняй вагі або атлусцення, пасля 25 гадоў бесперапыннага росту стабілізаваўся.**

Па даных федэральных цэнтраў па кантролі і прафілактыцы захворванняў, у 2003—2006 гадах узровень поўных дзяцей ва ўзросце ад 2 да 19 гадоў складаў 32 працэнты, на атлусценне пакутавалі 16 працэнтаў дзяцей. Пасля пастаяннага росту працэнта хворых на атлусценне дзяцей, які назіраўся з 1980 года, лічбы не змяняліся некалькі гадоў запар. Эксперты ўпэўненыя, што стабілізацыя колькасці поўных дзяцей адбылася дзякуючы правільнай палітыцы харчавання, якая праводзіцца шматлікімі школамі, і ўвазе бацькоў, якія вучаць дзяцей добра і правільна харчавацца і прымушаюць іх займацца спортам. Сярод дарослага насельніцтва таксама назіраецца стабілізацыя. У той жа час колькасць мужчын і жанчын, якія пакутуюць на празмерную паўнату, заставалася нязменнай: поўных мужчын у ЗША было 33 працэнты, жанчын — 35.



ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
СВАЯ СПРАВА
ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ!
КРАІНА ЗДАРОЎЯ

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 9200 рублёў на месяц<br>27600 рублёў на квартал<br>55200 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8700 рублёў на месяц<br>26100 рублёў на квартал<br>52200 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 14700 рублёў на месяц<br>44100 рублёў на квартал<br>88200 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 13400 рублёў на месяц<br>40200 рублёў на квартал<br>80400 рублёў на паўгоддзе |
| ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку) | | |
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 7700 рублёў на месяц<br>23100 рублёў на квартал<br>46200 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 7230 рублёў на месяц<br>21690 рублёў на квартал<br>43380 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 10330 рублёў на месяц<br>30990 рублёў на квартал<br>61980 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 9760 рублёў на месяц<br>29280 рублёў на квартал<br>58560 рублёў на паўгоддзе |

Забытае? Новае? Вечнае!

# У ГОД СМЕРЦІ ВЯСЕЛЛІ НЕ СПРАЎЛЯЮЦЬ

**Надзея Якаўлеўна з Уздзенскага раёна задала наступнае пытанне: «22 лістапада мінулага года ў мяне памерла маці. Мой сын (унук памерлай бабулі) збіраецца жаніцца ў жніўні гэтага года. Ці можна ў гэты час ладзіць вяселле?»**

Практычна кожны дарослы чалавек жыве адначасова ў некалькіх сістэмах вымярэння часу. З аднаго боку, ён падпарадкоўваецца агульнай плыні часу, у якой жыве фактычна ўсё чалавецтва: бягучы год — гэта 2008 год з дня нараджэння Ісуса Хрыста. І ўсе мы адносім не толькі найбольш значныя, але і паўсядзённыя падзеі жыцця з гэтым вектарам-плынню. Нехта загадзя, напрыклад, вызначае, што 22 чэрвеня сёлетняга года ў школе ці ва ўніверсітэце; нехта ўжо пачаў падрыхтоўку да вяселля, якое адбудзецца ў самы незвычайны (праз прызму нумаралогіі) дзень гэтага года — 08.08.2008 г. З другога боку, кожны з нас мае свой уласны каляндар, які адлічвае самыя розныя прамежкі часу (перыяды, цыклы), якія маюць важнае значэнне толькі для нас. Напрыклад, муж і жонка, якія пражылі ў пары 25 гадоў, маюць права святкаваць срэбранае вяселле. І так бясконца колькасць сваіх кропак адліку часу.

Паралельна з гэтым у нашым жыцці існуюць яшчэ два вельмі важных календары, з якімі мы суадносім перш за ўсё святочныя падзеі. Адзін з іх (той, адзіны, які, уласна кажучы, і мае права называцца календаром) парадкуе, сістэматызуе, вызначае паслядоўнасць гадавых народных, царкоўных або дзяржаўных (свецкіх) святаў. Сярод іх Каляды, Новы год, Вялікдзень, Дзень Перамогі, Купалле і інш. Гэты каляндар спрыяе аб'яднанню і ўзаемаразуменню вялікай колькасці людзей. Напрыклад, свята Трох Каралёў яднае каталікоў, Узнясенне — праваслаўных, Дзень Перамогі — людзей розных рэлігій, але перш за ўсё тых, хто змагаўся супраць фашысцкай чумы XX стагоддзя

Здараецца так, што каляндар, які быў створаны ў 46 г. да н. э. Юліем Цэзарам, і аб'ядноўвае, і раз'ядноўвае еўрапейскае супольніцтва. Справа ў тым, што Праваслаўная царква вядзе адлік часу якраз па юліянскім календары. Аднак у сваім грамадскім жыцці мы карыстаемся новым стылем, уведзеным у 1583 г. папам каталіцкай Царквы Грыгорыем XIII. У выніку склалася не зусім зразумелая сітуацыя: калі ў сям'і муж католік, а жонка праваслаўная, то яны адзначаюць адно і тое ж хрысціянскае свята двойчы.

Акрамя календарных святаў, у нашым жыцці існуе яшчэ адно кола падзей, якое называецца сямейна-родавыя святы і абрады, і якое ўступае ў складаныя адносіны з гадавым календаром. Да гэтых абрадаў мы адносім найперш дзень нараджэння, вяселле і пахавальна-памінальныя рытуалы, а таксама абрады, звязаныя з будаўніцтвам і асваеннем новай хаты. Кожны з пералічаных святочна-абрадавых комплексаў па-свойму суадносіцца з гадавым календаром падзей. Мы ж канцэнтруем увагу на тым, што названыя намі сямейна-родавыя абрады — гэта складаныя і працяглыя комплексы рытуальных дзеянняў, правілаў, прадпісанняў, парадкаў, абмежаванняў і катэгарычных забарон. І ўсе яны без выключэння ахопліваюць **перыяд часу працягласцю... у адзін год!** Звернём увагу: цыкл календарных святаў ахоплівае год, і кожнае з сямейна-родавых святкаванняў таксама доўжыцца роўна год.

Усе мы прывыкліся і добра памятаем, што пасля смерці чалавека жалобныя сталы ладзяць на 3-і, 9-ы і 40-ы дні і ў год. Яшчэ раз падкрэсліваем: пасля смерці чалавека памінкі ладзяць некалькі разоў на працягу першага **года**. Насамрэч аказваецца, што і ўсе астатнія сямейна-родавыя **святкаванні** расцягваюцца на **цэлы год**.

Давайце па парадку. У вашай сям'і нарадзілася дзіця. З гэтага дня і на працягу года сям'я будзе прытрымлівацца шэрагу абмежаванняў, звязаных з працэсам «ужыўлення» нованароджанага ў склад сям'і і Роду. Асноўныя ж падзеі будуць прымеркаваны да тых дзён, якія звязаны з універсальным рытмам 0—3—9—40—1 год. Так, на працягу трох першых дзён пасля з'яўлення немаўляці ні адзін з членаў сям'і нікому нічога не пазычаў; на дзевяты дзень праводзілі абрад першага рытуальнага купання дзіцяці; на саракавы дзень дзіця хрысцілі і спраўлялі абрад хрэсьбінаў; да года дзіця не стрыглі. Не паказвалі ў люстэрка, а яго рэчы не перадавалі іншым дзецям.

А самае галоўнае, **што дзень нараджэння чалавека станавіўся дадатковым святам (для сям'і і Роду) у сістэме ўсіх каляндарных падзей.**

Іншая святочна-абрадавая сітуацыя. Род збіраецца ладзіць вяселле аднаму са сваіх маладых прадстаўнікоў. Але гэта родавая падзея павінна дакладна суадносіцца з прыродна-касмічнымі, сацыякультурнымі і маральна-этычнымі патрабаваннямі (сістэмай каштоўнасцяў), якія сканцэнтраваныя ў народна-хрысціянскім календары. Сярод іх наступныя: у высакосны год лепш не жаніцца, у пост маладых не будуць вянчаць у царкве. Вяселле лепш не спраўляць у маі на апошняй фазе Месяца (на сходні). Гэта значыць, што каляндарны год меў як спрыяльныя, такі і неспрыяльныя перыяды для гуляння вяселляў. Такім чынам, вяселле падпарадкоўвалася каляндарным падзеям і цалкам залежала ад іх.

Акрамя таго, момант шлюбавін зноў-такі распачынаў новы этап у жыцці маладажонаў і іх сваякоў, які структурыраваўся ў адпаведнасці з ужо вядомым нам універсальным рытмам. Вяселлі доўжыліся тры дні, на дзевяты дзень спраўлялі «пярэзвы» («Бліны», «падвясёлкі»), а з гэтага часу і да саракавога дня ў маладых быў «мядовы» месяц.

Ніводная сям'я не пазбегне яшчэ адной падзеі, якая таксама багата абстаўлена рытуаламі. Калі паміраў чалавек, то на трэці дзень яго хавалі, а пасля гэтага спраўлялі хаўтуры: «траціны», «дзевяціны», «саракавіны» і «ўгодкі».

Аднак смерць чалавека — у параўнанні з днём нараджэння і вяселлем — надзялялася самым высокім статусам, таму гэта жалобная падзея на цэлы год ... адмяняла ўсе — і каляндарныя, і сямейна-родавыя — святы. Адным з першых дзеянняў пасля смерці блізкага чалавека было спыненне ходу насценнага (агульнасямейнага) гадзінніка, што якраз і сведчыла: на наступны год (кропка адліку — дзень смерці) сям'я выключаецца з усіх святкаванняў: яна ў жалобе. Менавіта таму ў тых сем'ях не фарбуюць яйкі ў чырвоны колер перад Вялікаднем.

Яшчэ раз удакладняем правіла нашай шматвяковай традыцыі: на працягу года сям'я памерлага не можа прымаць удзел ні ў якіх святкаваннях, а таксама не распачынаюць ніякіх рамонтна-будаўнічых работ.

У гэтай сувязі, шаноўная Надзея Якаўлеўна, вашай сям'і лепш сесці за стол перамоў з вашай будучай раднёй з боку нявесты і знайсці выйсце-паразуменне, якое будзе задавальняць абодва бакі. **Магчыма, сваёй смерцю бабуля дала ўнуку знак — падумай і не прымай паспешлівага рашэння.** Мала таго, што год высакосны, то яшчэ і смерць самага блізкага чалавека быццам бы выступаюць супраць ці то часу правядзення, ці то самога вяселля.

На жаль, наша моладзь не заўсёды прыслухоўваецца да такіх папярэджанняў. Яна ладзіць свята толькі для сябе, не думаючы пра тое, што сэрца маці разрываецца ад неабходнасці зрабіць выбар: не пакрыўдзіць сына і не зганьбіць памяць аб роднай маці. Больш за тое, нам вядомы шматлікія сем'і, якія былі створаны вось пры такіх абставінах і якія аказаліся зусім недаўгавечнымі. Таму можа лепш устрымацца ад непрадказальных і неабгрунтаваных эксперыментаў?

**Аксана КАТОВІЧ,**
**Янка КРУК.**

# Узгадаць кожнае імя: апошняя спроба

**Паўтара года таму Беларусь уключылася ў міжнародны праект па ўвекавечанні імёнаў яўрэяў, якія загінулі ў перыяд Халакоста. Аўтар праекта — дырэктар Інстытута Катастрофы і Гераізму яўрэйскага народа Яд Вашэм (Іерусалім) паставіў перад сусветнай грамадскасцю, здаецца, невыканальную задачу: праз 60 гадоў пасля катастрофы ўзгадаць кожнага з шасці мільёнаў нявінна забітых. Тым не менш толькі ў Беларусі сіламі яўрэйскай абшчыны за паўтара апошніх года былі ўвекавечаны 21 624 імёны. Гэта работа працягваецца. Днямі ў Мінску, Віцебску і Бабруйску былі ўручаны граматы з падзякай валанцёрам — удзельнікам праекта самім старшынёй Савета дырэктараў мемарыяльнага комплексу Яд Вашэм Аўнерам Шалевам, які наведаў нашу краіну ўпершыню.**

Многія лічаць гэты візіт генеральнага дырэктара Інстытута Катастрофы пераломным у прызнанні сусветнай грамадскасцю памераў трагедыі, якая адбылася на тэрыторыі нашай краіны. «Дваццаць гадоў таму я ўпершыню пабываў у мемарыяле Яд Вашэм, — сказаў старшыня Саюза яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў Леанід Левін, — там убачыў карту свету з абазначанымі на ёй яўрэйскімі гета ў гады Другой сусветнай вайны. На тэрыторыі Беларусі стаяла толькі адна кропка — у Мінску. Але ўжо тады мне было дакладна вядома пра больш чым 200 гета на тэрыторыі нашай краіны. Фашысты знішчылі тут больш за 800 тысяч яўрэяў, альбо адну сёмую частку ад агульнай колькасці па ўсім свеце — гэта вялізная колькасць. Аднак пра гэта сусветная грамадскасць практычна не ведае».

Лісты сведак, запоўненыя сваякамі і блізкімі загінулых, мемарыял Яд Вашэм збірае з сярэдзіны 50-х гадоў. Гэтыя лісты — сімвалічны помнік ахвярам Халакоста — захоўваюцца ў Пантэоне Імёнаў Яд Вашэм у Іерусаліме. У 2004 годзе на Інтэрнэт-сайце Інстытута катастрофы (www.yadvashem.org) апублікаваны больш за 3 млн імёнаў. Цэнтральная база даных імёнаў ахвяраў Халакоста пераведзена на рускую мову. Цяперашняя праграма — апошняя спроба вярнуць імёны людзей, якія калісьці жылі, спадзяваліся, марылі, кахалі...

— Назва мемарыяла Яд Вашэм паходзіць з Кнігі прарока Ісаі: «...Ім дам і ў доме маім і ў сценах маіх памяць і імя (яд вашэм)... Якія не знішчацца», — патлумачыў на сустрэчы з мінскімі валанцёрамі — удзельнікамі праекта Аўнер Шалеў. — У нашых архівах захоўваецца больш за 80 млн дакументаў, якія датычацца катастрофы. Сярод іх шмат дзённікаў і лістоў тых, хто загінуў. І часцей за ўсё апошняе іх жаданне было: «Памятайце, што мы жылі, што мы жадалі ўнесці ў гэты свет частку сябе»... Мы імкнёмся аднавіць сувязь паміж нашымі дзецьмі і тымі, каго яшчэ помняць людзі. На жаль, час бязлітасны. Тым не менш кожны дзень нехта ўзгадвае яшчэ імя.

Мемарыялам Яд Вашэм распрацавана спецыяльная праграма па ўвекавечанні імёнаў яўрэяў, забітых на акупацыйных тэрыторыях былога СССР. Праект ажыццяўляецца ў Беларусі, ва Украіне, у Расіі, Малдове, Літве, Латвіі, Эстоніі і Ізраілі. Цікава, што дзякуючы праекту ўз'ядналіся некалькі тысяч сем'яў, члены якіх не ведалі, што нехта са сваякоў выжыў.

— У Беларусі над праектам працуе каля ста валанцёраў, — паведаміла старшыня Рэспубліканскага фонду «Халакост» і кіраўнік праекта па ўвекавечанні імёнаў яўрэяў, якія загінулі падчас Халакоста, Іна Герасімава. — У 16 гарадах знаходзяцца нашы каардынатары. Мы збіраем сведчанні, працуем з кнігамі «Памяць», супрацоўнічаем з мясцовымі ўладамі, архівамі, музеямі, краязнаўцамі і школамі. На II Рэспубліканскі конкурс «Халакост. Гісторыя. Урокі талерантнасці», які мы праводзім пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь, сёлета былі прысланы 990 работ. У гэтых работах — шмат новых спісаў.

Разам з тым, адзначае Іна Герасімава, многія людзі, якія яшчэ памятаюць тых, хто жыў з імі побач, суседзяў альбо сваякоў, проста не ведаюць, што яны могуць пра іх расказаць...

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

З рэдакцыйнай пошты

## Добры дзень, шаноўная рэдакцыя!

Давайце разам зробім высакародную справу. Установа культуры «Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова» збірае матэрыялы пра ўдзельнікаў вызвалення Віцебска і Віцебшчыны. Дарагія ветэраны, іх дзеці і ўнукі, сваякі і знаёмыя! Дасылайце ўспаміны пра гераічны час вызвалення Віцебска, Прыдзвіння на адрас музея. Каштоўныя для гістарычнай навукі матэрыялы не павінны знікнуць беззваротна!

Музей ажыццяўляе мультымедыйны праект «Яны змагаліся за Радзіму» — да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Каардынатарам праекта з'яўляецца дырэктар музея Ірына Шышкова. Гэты праект будзе рэалізаваны ў горадзе над Дзвіной на працягу 2008—2009 гадоў. Мэта праекта — увекавечванне памяці аб ветэранах і ўдзельніках Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнцах Віцебска, якія пражываюць ці пражывалі пасля вайны ў розных куточках Беларусі, іншых рэспубліках былога СССР. Усяму сабранаму матэрыялу будзе нададзены электронны выгляд, ён будзе размешчаны ў Інтэрнэце, выйдзе серыя брашур. А арыгіналы вашых успамінаў будуць пакінуты на захоўванне ў музеі М.П. Шмырова.

Свае матэрыялы, успаміны, фотаздымкі дасылайце на адрас музея: вул. Чэхава, 4, Віцебск, 210026.

З павагай,
**Канстанцін КАРНЯЛЮК.**
*г. Віцебск.*

# «ТАМ ПАЛОВА ОРШЫ ЖЫВЕ...»

**Свае 305-я ўгодкі ўрачыста адзначае сёлета адзін з найпрыгажэйшых гарадоў свету Санкт-Пецярбург. Пра сувязі паўночнай сталіцы Расіі з Беларуссю можна распавядаць доўга і шмат. Мая ж задача больш сціплая: паказаць сувязь Пецярбурга з Оршай, дакладней, Оршы з Пецярбургам.**

Для загалоўка пазычыў словы свайго слыннага земляка Уладзіміра Караткевіча з ліста, накіраванага ім увесну 1958 года ўніверсітэцкаму таварышу, кіяўляніну Міхаілу Гальдштэйну. Працуючы ў той час настаўнікам у Оршы, малады пісьменнік марыў пасля заканчэння цяжкага навучальнага года наведаць Ленінград. «Лета будзе вольным. А потым магу і ў Піцер з вамі паехаць, — піша У. Караткевіч, — спыніцца там ёсць дзе: трэба будзе праз цётку Жэню спісацца з яе знаёмымі. А не дык не, там палова Оршы жыве. Будзем там жуіраваць жыццём колькі ўлезе, думаю, што лепшае ў горадзе ты мне пакажаш» (пераклад з рускай мовы, ліст захоўваецца ў фондах Аршанскага музея У. Караткевіча).

Зразумела, палова Оршы ў Піцеры — мастацкае перабольшванне, хоць у даваенныя, і, асабліва, у пасляваенныя гады шмат якія нашы суайчыннікі (у тым ліку і аршанцы) паехалі туды жыць і працаваць. Таму і сустракаюцца яны ў сучасным Санкт-Пецярбургу не так ужо і рэдка: з 5,5 мільёна гараджан беларусаў амаль 100 тысяч. Але пра аршанцаў сярод іх — крыху ніжэй.

Спачатку пра гістарычныя сувязі Пецярбурга і Оршы, якая, дарэчы, у тры разы старэйшая за юбіляра. Па-першае, сам заснавальнік горада на Няве Пётр Вялікі быў нашчадкам у адзінаццатым калене аршанскага баярына Андрэя Кабылы. У XIV ст. той выехаў з Вялікага княства Літоўскага на службу да маскоўскага князя Сімяона Іванавіча Гордага, а адзін з яго сыноў Фёдар Кошка і стаў далёкім продкам царскай дынастыі Раманавых. Па-другое, будаўніцтвам заснаванага ў маі 1703 года Санкт-Пецярбурга непасрэдна кіраваў Аляксандр Меншыкаў. «Полудержавный властелин», пералік пасад і званняў якога не ўмясціўся бы ў некалькі дзесяткаў газетных радкоў, аказваецца, таксама меў беларускія карані (хоць радавод святлейшага князя падазрона цёмны). Аляксандр Пушкін, які глыбока вывучаў пятроўскую эпоху, згадвае пра тое, што А. Меншыкаў «адшукваў каля Оршы свой радавы маёнтак». І ўжо дакладна вядома, што ў 1709 годзе «счастья баловень безродный» дамогся ад польскага караля і вялікага князя літоўскага Аўгуста II перадачы яму Аршанскага старосты. А ў 1715 годзе набыў мястэчка Дуброўна. Невыпадкова, што ў поўным тытуле А. Меншыкава чытаем: «...губернатар Санкт-Пецярбургскі, староста Аршанскі».

А калі ўжо згадваць аршанскія карані «птенцов гнезда Петрова», нельга не назваць імя віцэ-канцлера, барона Пятра Шафірава. Яго бацька, Павел Шапіра, быў аршанскім яўрэем, які ў XVII стагоддзі перасяліўся ў Маскоўскую дзяржаву. Дарэчы, яго сын стаў першым «выхадцам з яўрэяў», якія дасягнулі высокіх дзяржаўных пасад у манархічнай Расіі.

У першай палове XIX стагоддзя Санкт-Пецярбург і Оршу злучыла шашэйная дарога. Накіроўваючыся на поўдзень, праз Оршу праязджалі многія выдатныя дзеячы расійскай культуры. Сярод іх і Аляксандр Пушкін, які быў у Оршы двойчы: у 1820 годзе, калі накіроўваўся ў паўднёвую ссылку, і ў 1824 годзе, калі вяртаўся з яе. Галоўная вуліца Оршы ўжо ў пачатку XIX стагоддзя атрымала назву Пецярбургская (цяпер гэта вуліца Леніна), бо выходзіла на Пецярбургскі паштовы тракт. Праўда, у Оршы не было і няма вуліцы Ленінградскай, як у Піцеры няма Аршанскай. Тым не менш, беларуская тэматыка ў тапаніміцы паўночнай сталіцы Расіі прысутнічае. Больш за ўсіх «адзначаны» Віцебск: ёсць Віцебскі вакзал, Віцебскі праспект і вуліца. Акрамя гэтага — Беларуская вуліца, Брэсцкі бульвар, вуліцы Касцюшкі і Канстанціна Заслонава.

Чыгунка злучыла Пецярбург і Оршу ў 1902 годзе. Тады ж Орша стала вузлавой станцыяй, найбуйнейшай не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Расійскай імперыі. Паказальна, што менавіта ў Оршы пецярбуржцы робяць цяпер перасадку на цягнікі, якія ідуць у заходнім накірунку. Маючы ў сваім распараджэнні некалькі гадзін вольнага часу, яны, відаць, ужо генетычна валодаючы прыроджанай інтэлігентнасцю, звычайна выкарыстоўваюць іх для знаёмства з помнікамі старажытнага горада, наведваюць яго музеі.

Як вядома, Пецярбург валодае найбагацейшымі скарбамі гістарычных рэліквій і культурных каштоўнасцяў усіх часоў і народаў. Маюцца ў горадзе на Няве і аршанскія рарытэты. Напрыклад, у Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы ёсць унікальныя выданні славутай Куцеінскай друкарні XVII стагоддзя. А ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве захоўваюцца шматлікія дакументы XVIII—пачатку XIX стагоддзя, якія тычацца гісторыі Оршы і наваколля. На жаль, працаваць з імі цяпер вельмі дарагое задавальненне — за ўсё трэба плаціць. Так што шмат якія тайны аршанскай даўніны раскрыюцца даследчыкам не хутка. А шкада.

За тры стагоддзі існавання Пецярбурга ў ім жылі і жывуць сотні тысяч ураджэнцаў Беларусі. Былі і ёсць сярод іх аршанцы. Прыгадаем некаторых. Карэнным ленінградцам-піцерцам стаў выдатны фізік Барыс Пятровіч Захарчэня. А з'явіўся на свет будучы вучоны ў 1928 годзе ў Оршы (у пасведчанні аб нараджэнні горад яшчэ названы Воршай). Уся яго працоўная біяграфія была звязана з Фізіка-тэхнічным інстытутам імя Іофэ. Б. Захарчэня быў акадэмікам Расійскай АН, лаўрэатам Ленінскай і Дзяржаўнай прэміі СССР. А яшчэ яго звязвала цеснае сяброўства з калегам, нобелеўскім лаўрэатам Жарэсам Алфёравым (таксама, дарэчы, ураджэнцам Віцебшчыны). Застаецца дадаць, што ў 1998 годзе імем Захарчэні была названа адна з малых планет Сонечнай сістэмы.

Зоркамі першай велічыні спорту з'яўляюцца цяперашнія піцерцы, ураджэнцы Оршы Сяргей Капляков, плывец, алімпійскі чэмпіён і Антаніна Лангіна (Захарава), чэмпіёнка свету па рускіх шашках.

Сярод ураджэнцаў Оршы — пецярбуржцаў — выкладчыкі і бізнэсмены, мастакі і медыкі, ваенныя і дзяржаўныя служачыя.

Некалькі гадоў таму Орша ўстанавіла партнёрскія сувязі з Чырвонагвардзейскім раёнам Санкт-Пецярбурга (відаць, і таму, што намеснік кіраўніка Адміністрацыі і начальнік упраўлення культуры — нашы землякі). Хочацца спадзявацца, што яны будуць плённымі і трывалымі.

**Віктар ЛЮТЫНСКІ,**
**выкладчык гісторыі Аршанскага дзяржаўнага механіка-эканамічнага каледжа, краязнавец.**

## Леанід Дранько-Майсюк:

# «ІНТЭЛЕКТ ВЫШЭЙ ЗА ПАЧУЦЦІ»

***Як сэрцу выказаць сябе? У дзяцінстве здаецца немагчымым зрабіць гэта: слоў няма... А так хочацца расказаць каму-небудзь... і сабе пра гэта.***

***У адзінаццатым класе прагучалі радкі з паэмы Маякоўскага «Пра гэта», пра самыя інтымныя чалавечыя пачуцці.***

***Здаецца, толькі ў паэзіі магчыма весці размову на мяжы эмоцый. У гэтай краіне кахаюць праз словы. Самае высакароднае пачуццё нарадзіла высокія вершы.***

### Пра гэта

Вядомы лірычны паэт Леанід Васільевіч Дранько-Майсюк піша пра тое, што кранае мяне і маіх равеснікаў. Менавіта таму я звярнулася да яго: «Як зразумець сябе і сваё самае патаемнае?».

Трэба верыць у свае сілы, не баяцца інтэлігентнасці, якая ёсць у душы кожнага чалавека, вучыцца больш слухаць і менш гаварыць. І ўвогуле трэба навучыцца чакаць:

*Калі шапталі, як маленне,*
*У першую сваю зіму:*
*«Калі навучымся цярпенню,*
*Тады навучымся ўсяму».*

Сціпласць, інтэлігентнасць, увага да іншых і валоданне мастацкім чаканнем — усё гэта ўнутраная прыгажосць, якая дапаможа выказаць сябе.

Каханне, як зрок, слых, нам дадзена ад прыроды. Яно бывае розным, але я думаю, што кожны здольны кахаць па-сапраўднаму, проста не ўсе могуць выказаць свае пачуцці прыгожа, спакойна, з розумам. Іншым шляхам, на мой погляд, немагчыма.

*Ты,— памножаная на неба*
*І падзеленая на страх,—*
*Здабываеш са смутку срэбра*
*Старажытных вясёлых драхм.*

Трэба баяцца неўраўнаважаных эмоцый, верыць у спакой і не верыць у крык. Спакой — першая рыса ўнутранага арыстакратызму, а крык — плебейства. Паколькі каханне — пачуццё арыстакратычнае, яно вымагае спакою.

*...казаў рыцар сучаснасці, кожны раз робячы націск на слове «спакой». Слухаеш яго і пачынаеш разумець тое ж самае, нібы трапляеш у невыказную залежнасць ад вымаўленых словаў, глыбокадумных вачэй. Не пакідае толькі адно: «Гэты чалавек прыгожа гаварыў пра каханне без усялякіх прыгожасцяў. Толькі сэрца ды... спакой?»*

*Ты далей, чым слова далёка,*
*І чысцей за ўсе халады...*
*Неўрадлівы пясок сірока*
*Засыпае твае сляды.*

Калі каханне прыходзіць у пятнаццаць год — гэта цудоўна! Яно прыносіць больш эмоцый, чым сталае каханне, таму ў юныя гады патрэбна прыгожа ўтаймоўваць сваю эмацыянальнасць, ураўнаважваць свае пачуцці цвярозасцю. Трэба паверыць у самае асноўнае: каханне — з'ява дастаткова кароткая.

*Як у гэтым узросце не хочацца верыць у слова «канец»!*

У літаратуры празаікі і паэты са злому псіхалогіі выбудоўваюць свае сюжэты. А для жыцця гэтае правіла не падыходзіць. Праз тое, што знікла каханне, жанчына не павінна падаць пад цягнік. А ў рамане Л. Талстога жанчына павінна кідацца пад цягнік, бо без гэтага не будзе рамана. Правілы жыцця не супадаюць з правіламі літаратуры.

Калі мяне гэтая дзяўчына не зразумела, дзякуй Богу! Трэба ветліва, інтэлігентна развітацца. Мне, юнаку, не пашанцавала на гэтай вуліцы — я пайду на суседнюю і там спаткаю тую, якая мяне зразумее і пакахае. Тое ж самае датычыцца і дзяўчыны. Трэба культурна разысціся, паспрабаваць застацца сябрамі. А каханне гэтая дзяўчынка можа спаткаць і ў суседнім доме, і на суседняй вуліцы, у суседнім горадзе. Трэба навучыцца чакаць.

Ведайце, што нашыя пачуцці могуць быць памылковымі. Патрэбны час, каб зразумець праўду і падумаць. Ці нам пятнаццаць, ці пяцьдзесят, трэба думаць. Ці можна так рабіць, казаць, сустракацца. Галоўнае — інтэлект вышэй за пачуцці, вышэй за сэрца. Нездарма ўсё так размешчана: прыкметы полу на самай нізкай ступені, паміж імі і розумам размешчаны пачуцці. Трэба выпрацоўваць у сваім жыцці культ інтэлекту.



Яшчэ адно важнае правіла: сын павінен слухацца бацьку, дачка — маці. Калі мы будзем жыць паводле гэтых правілаў, то жыццё будзе ўпарадкаваным. Калі не — наш жыццёвы цягнік пойдзе пад адхон. І калі маці кажа, што пачуцці былі павярхоўныя, хлопец гэты табе не падыходзіць, то, мабыць, яна мае рацыю. Хутчэй за ўсё так і будзе. Прыродай закладзена: ніякая маці і ніякі бацька благога сваім дзецям не жадаюць. А ўжо калі мы створым для сябе нейкі матэрыяльны падмурак, то зможам быць незалежнымі ад бацькоў.

*І ўсё-такі што такое сапраўднае каханне?*

*Калі паміраюць планеты —*
*застаюцца свінцовыя воды*
*І свісцячая песня пяскоў*
*у расколінах скал.*
*Калі памірае каханне...*
*Але каханне не памірае.*
*Яно вечна застаецца*
*ў грудзях лікуючай тугою слоў,*
*Безнадзейным болем*
*і непатольнай пяшчотай,*
*Калі нічым не дапаможаш,*
*хаця сэрца аб зоры разбі.*
*Вечнага кахання не бывае?..*

Караткевіч — вялікі рамантык. Але яго рамантызм не прынёс яму шчасця.

Сапраўднае каханне — гэта вялікая штодзённая праца над сабой. У свой час у Маскве мая будучая жонка мне, студэнту, кожны дзень прыносіла піражкі з павідлам. Я іх не паспяваў з'ядаць, таму мае сябры з ахвотай дапамагалі. Вось што такое каханне — піражкі прыносіць кожны дзень. Каханне — гэта я павінен. Ні ён, ні яна, а я. Тады пачынаецца сапраўднае каханне.

У Якуба Коласа ёсць верш «Ці помніш ты, Ганна, шчаслівы момант», там гучаць такія радкі: «І лапці са спіны мае ты зняла, анучы ў Нёман ты мыць панясла». Што зрабіла дзяўчына? Прызналася ў каханні! Хлопец у момант зразумеў: вось мая будучая жонка. Гэта геніяльнае прызнанне ў каханні: колькі сэнсу маюць дзеянні, чаго часам не маюць прыгожыя словы.

Каханне — пачуццё тупіковае, гэта хвароба, калі каханая закрывае сабою ўвесь свет, усё жыццё, іншых людзей. Небяспечна цалкам аддаваць сябе, а калі мы стыхію кахання ўтаймоўваем сваёй цвярозасцю, сваёй шляхетнасцю, то яно стане стваральным. Не трэба жыць толькі паводле правілаў кахання. Калі яго шмат, то гэта ўсё адно, што шмат алкаголю. Таму трэба баяцца такога кахання.

*У кахання заўсёды ёсць будучыня. Часам, яна прыносіць трывогу: хочацца пакінуць пасля сябе толькі светлы след. Каб аднойчы табе сказалі:*

*Я растлумачу,*
*што значыць вар'яцтва —*
*Гэта, кранучы мінулае тло,*
*Шчыра каханай жанчыне*
*прызнацца,*
*Колькі ў цябе некаханых было.*

Не трэба баяцца будучыні. Сапраўднае пачуццё абавязкова застанецца ў памяці. Калі мы будзем сваёй прысутнасцю прыносіць радасць людзям, прытрымліваючыся правілаў сціпласці, інтэлігентнасці, умення чакаць — то ўсё будзе добра.

### Эпілог

***Ведаю, што Леанід Васільевіч не з'яўляецца прафесійным гіпнатызёрам, але на многае пасля сустрэчы з ім паглядзела інакш. Яго добразычлівасць, унутраны спакой і гармонія перадаліся і мне, бо яму таксама было семнаццаць і ён кахаў.***

**Крысціна РЫБІК,**
**вучаніца 11 «А» класа сярэдняй школы № 211 г. Мінска.**

